Грамадскае незалежнае выданне, выходзіць са студзеня 1997 года

Газета для вас

17–23 красавіка 1999 года
№ 16 (174)
Наш індэкс 63834

Цана па падпісцы — 8000 руб.
Цана ў розніцу — 12000 руб.

ІВАЦЭВІЧЫ–БАРАНАВІЧЫ–БЯРОЗА–ПРУЖАНЫ

НАВІНЫ: ЧАС МЯСЦОВЫ

ІВАЦЭВІЧЫ

Калі ёсць натхненне

Газета "Рэспубліка" штогод праводзіць конкурс на лепшы аўтарскі фотаздымак, малюнак і калаж. У 1997 годзе ў ім удзельнічаў фотакарэспандэнт "Газеты для вас" Аляксей Ганчук. Ён змог знайсці той факт, вобраз, ракурс, які прынёс яму перамогу. Вынікі фотаконкурсу "Рэспубліка-98" таксама абрадавалі А. Ганчука: ён атрымаў другую прэмію. Што ж прынясе конкурс "Рэспубліка-99", у якім таксама ўдзельнічае Аляксей Іванавіч? Хай яму і на гэты раз пашанцуе.

Дарункі бібліятэцы

У ходзе аперацыі "Дарунак", што летась праводзілася ў Івацэвіцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя П. Пестрака, многія чытачы дарылі ёй цікавую літаратуру. Выкладчыца ПТВ-162 Галіна Галаўко прынесла раманы "Мёртвыя душы" М. Гогаля, "Выхаванне пачуццяў" Флабэра, "Апранутыя каменем" В. Форш і тры зборнікі выбраных твораў Ж. Сімянона. Сакратар-машыністка раённага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Таіса Лаўрусевіч падарыла тры тамы выбраных твораў І. Новікава і аднатомнік А. Крысці. Ад старэйшай чытачкі, пенсіянеркі Рэгіны Валошчык бібліятэка атрымала ў падарунак 11 кніжак беларускіх аўтараў і больш за 30 грампласцінак з запісамі рамансаў, класічнай музыкі і песень 60-х гадоў.

Сярод тых, хто зрабіў падарунак бібліятэцы, — супрацоўнік раённага аддзела ўнутраных спраў Анатоль Дзікан, прыватны прадпрымальнік Ларыса Ашакс, бібліятэчны работнік Галіна Янковіч, чыгуначнік Аляксандр Скробат.

— Не прывыклі сёння мы да шчодрасці. Таму ўсялякая дабрачыннасць радуе і выклікае словы падзякі, — гаворыць загадчыца абанемента Ганна Якаўлеўна Ашкала. — Істотна дапамаглі нам раённая інспекцыя па экалогіі і ўстанова УЖ 15/5. Першая выдаткавала нам 4 мільёны рублёў, другая — 5 мільёнаў. Канешне, гэтыя сумы па цяперашніх мерках не астранамічныя. За гэтыя грошы мы набылі 331 экзэмпляр мастацкай і навукова-папулярнай літаратуры, з іх 82 падручнікі для чытальнай залы. Хочацца падзякаваць ад усёй душы ўсім нашым спонсарам.

Вось ужо сапраўды: нехта абдзірае, а нехта дапамагае.

Смерць на рабочым месцы

Начная змена падыходзіла да канца, калі майстар Івацэвіцкага спіртзавода (прыкладна ў 7.30) зайшла ў цэх па вытворчасці вуглекіслаты, каб паглядзець на паказанні прыбораў. У памяшканні адчувалася загазаванасць, а рабочы Уладзімір Пранько, 1939 г. н. — о, божухна — ляжаў нерухома. Выкліканыя медыкі хуткай дапамогі канстатавалі смерць чалавека.

— Абставіны склаліся так, што можна было зрабіць вывад, што чалавек задыхнуўся ў загазаваным памяшканні, — гаворыць начальнік Бярозаўскай міжраённай працоўнай інспекцыі В. Ф. Супруновіч. — Аднак судова-медыцынская экспертыза пасля анатаміравання трупа не выявіла ў лёгкіх нябожчыка газа, смерць наступіла ад сардэчнай недастатковасці. Рабочы ўжо быў мёртвым, калі сарвала пракладку фільтра і газ запоўніў цэх.

КОНКУРС "САМАЯ ОБАЯТЕЛЬНАЯ И ПРИВЛЕКАТЕЛЬНАЯ"



ТАТЬЯНА. По гороскопу — Скорпион. Любимым певцом был Ф. Киркоров, но, увидев его однажды накрашенным, поостыла в чувствах. Люблю песни Уитни Хьюстон, Софии Ротару. Считаю себя счастливым человеком, потому что у меня дочь, куча друзей, любимая работа и нет много денег.

ПРУЖАНЫ

Жэст незадаволенасці

Калектыў дзяржаўнага прадпрыемства "Жыллёвік", які абслугоўвае жыллёвы фонд раёна, правёў аднадзённую забастоўку. Прычына зусім не новая для нашага "стабільнага" часу: незадаволенасць нізкім узроўнем заработнай платы. Пра пачатак такога пратэсту калектыў загадзя, за два тыдні, паведаміў у райвыканкам і свайму гаспадару — раённаму вытворчаму аб'яднанню жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

Ненадзейны мост

У які раз абваліўся на райцэнтраўскім возеры мост, які злучаў пляж з невялікім астраўком. Абышлося без надзвычайных здарэнняў, бо ў гэты момант аматараў прагулак у гэтым маляўнічым месцы не было. Калі ж мясцовыя ўлады паклапоцяцца пра мост і зробяць яго надзейным на доўгія гады?

БАРАНАВІЧЫ

ПАТРАБУЮЦЬ АДМЕНЫ ВЫНІКАЎ ВЫБАРАЎ У ГАРАДСКІ САВЕТ

Баранавіцкая арганізацыя беларускай Ліберальна-дэмакратычнай партыі (ЛДП) падала ў гарадскі суд іск на выбарчую тэрытарыяльную камісію па факце фальсіфікацыі ёю вынікаў прайшоўшых 4 красавіка выбараў дэпутатаў мясцовых Саветаў.

У іскавой заяве ліберал-дэмакратаў, у прыватнасці, адзначаецца, што назіральнікамі ад партыі, а таксама выбаршчыкамі Баранавічаў былі зафіксаваны шматлікія парушэнні выбарчага заканадаўства. Найбольш распаўсюджанае з іх — галасаванне аднаго члена сям'і за іншых. Зафіксаваны выпадкі, калі выбарчыя бюлетэні выдаваліся непаўналетнім. Акрамя таго, як указваецца ў іску, гарадскі камітэт ЛДП мае факты аб тым, што да 16.00 па ўсіх выбарчых акругах была дадзена вусная каманда аб "павышэнні" працэнта прагаласаваўшых, пасля чаго ў урны для галасавання былі падкладзены сфальсіфікаваныя бюлетэні. У выніку гэтага ўжо каля 17.30—18.00 працэнт яўкі выбаршчыкаў быў павялічаны з 22 да 48—51 працэнта.

Выступаючы напярэдадні выбараў па мясцовым тэлебачанні, старшыня Баранавіцкага гарвыканкама "недвухсэнсоўна" растлумачыў гараджанам, за каго ім трэба галасаваць. У заяве паведамляецца таксама, што адзін з членаў партыі — служачы гарвыканкама, які балатаваўся ў дэпутаты гарсавета ад ЛДП, — быў звольнены з працы па палітычных матывах.

Гарадскі камітэт ЛДП просіць судовыя органы праверыць вышэйвыкладзеныя факты і адмяніць вынікі выбараў у Баранавіцкі гарадскі Савет.

Неужели "Хвилинку" делают за минутку?

Простите за каламбур, но вывод напрашивается именно такой. На заводе торгового машиностроения среди прочих товаров народного потребления производится и сепаратор "Хвилинка". В общем объеме производства его удельный вес не велик — 0,5%. Но это не должно давать повод делать его не совсем качественно. Тем более, что не только в Беларуси, но и за ее пределами расходятся сепараторы.

Как явствует из материалов проверки центра стандартизации и метрологии, "Хвилинка" не соответствует стандартам по величине минимального зазора, номинальной потребляемой мощности, маркировке, упаковке и массе. Кстати, это не первое на заводе несоответствие выпускаемой продукции требованию стандартов. В феврале и апреле прошлого года проверялись электромясорубка и протирочно-резальная машина, которые тоже имели немало отклонений от ГОСТа.

Спакуса ў салоне

Незадаволеныя ўзроўнем сваіх даходаў пенсіянер Л. і 45-гадовая грамадзянка К. вырашылі самастойна паправіць матэрыяльнае становішча. Зайшоўшы ў Баранавіцкі салон для маладажонаў, "салодкая парачка" сцягнула 19,5 мільёна рублёў, тры калье са штучнага жэмчуга і частку залатога бранзалета. Знікнуць злодзеям не ўдалося — выкліканая прадаўцамі міліцыя хутка іх затрымала.

Далей — вядомая справа: суд...

БЯРОЗА

З асабістых падвор'яў

Вынікі агляду-конкурсу па закупу лішкаў малака ў насельніцтва за леташні год падвёў Брэсцкі канцэрн "Мясамалпрам" і яго прафкам.

Сярод сельвыканкамаў вобласці першае месца прысуджана Нарутавіцкаму сельскаму Савету Бярозаўскага раёна. З асабістых падвор'яў вяскоўцаў паступіла на мясцовы сыракамбінат 701 тона малака. У сярэднім кожная сям'я прадала дзяржаве па 2.056 кілаграмаў малочнай прадукцыі.

Прыклад выдатнай работы па закупу малака ад насельніцтва паказвае малаказборшчыца з вёскі Варажбіты Любоў Несцераўна Пукала.

Падборку "Навіны: час мясцовы" падрыхтавалі: Л. Цалуйка, А. Лаўранюк (Івацэвічы), С. Русецкі (Бяроза), прэс-цэнтр МА "Грамадзянскі форум" г. Пружаны, Г. Строцкая (г. Баранавічы) і фотакарэспандэнт А. Ганчук.

☎ *АЛЁ, РЭДАКЦЫЯ?*

ЭКАНОМІМ НА ЗДАРОЎІ

— "Газета для вас"? Не маглі б вы растлумачыць, чаму адключана ацяпленне ў жылых дамах? У кватэрах жа жыць немагчыма: сыра і холадна. Добра, калі ў сям'і няма маленькіх дзяцей. А што рабіць тым, хто гадуе немаўлятак?

Ірына ВАЛАСЮК, г. Івацэвічы.

У РВА ЖКГ нам сказалі, што ацяпленне ў дамах жыллёга фонду адключана з 9 красавіка г. г. на падставе рашэння Івацэвіцкага райвыканкама № 76р ад 6.04.99 г. Прычына такога рашэння — няхватка блакітнага паліва, неабходнасць яго эканоміі і плюсавая тэмпература на двары. Ад якіх-небудзь іншых каментарыяў адмовіліся. Таму паспрабуем паразважаць самі.

Мы нядаўна аб'ядналіся ў Саюз з Расіяй, ускладваючы на яго надзеі на паляпшэнне эканамічнай сітуацыі. Але, як бачна на прыкладзе з ацяпленнем, гэтыя надзеі не апраўдваюцца. Расія задарма нам нічога не дасць, тым больш — газ.

Па-другое, людзі, якія тэлефануюць у рэдакцыю наконт ацяплення, гавораць, што вымушаны ўключаць для ацяплення кватэраў газавыя духоўкі. Такім чынам, пра якую эканомію газа можна весці гаворку? Калі ў кватэры плача немаўля, то ніякае рашэнне райвыканкама не прымусіць бацькоў эканоміць газ. Гэтую духоўку, мо, не ўключаць толькі пенсіянеры, у якіх у кватэры стаіць газавы лічыльнік і пенсія якіх не дазваляе ім жыць у цяпле. Яны зэканомяць паліва згодна з рашэннем райвыканкама. Зэканомяць на сваім здароўі...

P. S. У Баранавічах, напрыклад, знайшлі больш падыходзячы варыянт дзеля эканоміі. Адключана ацяпленне толькі ў адміністрацыйных будынках. Для жылых дамоў, бальніц, школ і дзіцячых садкоў ацяпляльны сезон працягваецца.

НАВІНЫ РЭСПУБЛІКІ

А. Лукашенко посетил с однодневным визитом Югославию

14 апреля, в восемь часов утра, президент Беларуси вылетел из национального аэропорта "Минск" в Белград.

Напомним, что однодневный визит Александра Лукашенко в Югославию осуществлялся по приглашению президента этой страны Слободана Милошевича. В Белграде оба президента обсудили ситуацию, связанную с военным конфликтом на Балканах, а также вопрос о возможном присоединении Югославии к Союзу Беларуси и России.

Белорусская делегация во главе с президентом осмотрела некоторые объекты, подвергшиеся бомбардировке. А. Лукашенко посетил раненых в палате разрушенной военно-медицинской академии.

После переговоров С. Милошевич и А. Лукашенко дали пресс-конференцию для журналистов.

Дебаты кандидатов в президенты РБ

25 апреля в эфире белорусской службы "Радыё Свабода" прозвучит специальная программа, посвященная выборам президента, назначенным оппозицией на 16 мая.

По сообщению пресс-службы Центральной комиссии по выборам президента Республики Беларусь, на вопросы радиослушателей в эфире ответят кандидат в президенты Зенон Позняк и супруга кандидата в президенты Михаила Чигиря, который, как известно, находится под арестом. Они расскажут о предвыборных программах, ближайших планах, проанализируют ситуацию в Беларуси и пути выхода из кризиса.

Вопросы З. Позняку и Ю.Чигирь можно будет задать по телефонам в Праге: 4202/2112 3279, по факсу — 4202/2112 3280, а также по почте — Vinohradska 1, Praha 110 00 CZ Беларуская служба "Радыё Свабода".

Затрыманы дзёрзкі рабаўнік

Супрацоўнікамі праваахоўных органаў Брэсцкай вобласці раскрыта абрабаванне ювелірнай крамы "Жамчужына", якое з незвычайнай дзёрзкасцю было ўчынена ў Брэсце летась 23 снежня.

Нагадаем, што тады сярод белага дня ў краму ўварваўся рабаўнік у масцы і пад пагрозай пісталета ўзяў з вітрыны залатыя вырабы з каштоўнымі камянямі — усяго на суму каля 2,5 мільярда рублёў. Прыбыўшы па выкліку прадаўцоў нарад міліцыі ўбачыў толькі здзіўленыя твары пакупнікоў і разбітае шкло.

Днямі супрацоўнікамі камітэта па арганізаванай злачыннасці і міліцыі ў Баранавічах былў затрыманы 22-гадовы жыхар Іркуцка Іван В., які прызнаўся ў абрабаванні "Жамчужыны". Як аказалася, у поле зроку супрацоўнікаў праваахоўных органаў ён трапіў зусім па іншай справе, аднак прафесійнае чуццё не падвяло сышчыкаў, якія адразу ж знайшлі падабенства Івана В. з фотаробатам рабаўніка. Праведзеныя пазней крыміналістычныя даследаванні і вочныя стаўкі, а таксама знойдзены пры затрыманні газавы пісталет пацвердзілі, што ювелірную краму абрабаваў менавіта гэты чалавек.

Злачынца затрыманы, супраць яго ўзбуджана крымінальная справа. Вядзецца пошук месцазнаходжання выкрадзеных упрыгожванняў.

Тамара Віннікава збегла з-пад хатняга арышту

Былы старшыня праўлення Нацыянальнага банка Тамара Віннікава, якая з лістапада 1997 года знаходзілася пад хатнім арыштам, знікла ў невядомым напрамку.


Нагадаем, што крымінальная справа супраць Тамары Віннікавай была ўзбуджана напрыканцы 1996 года. Былы галоўны банкір краіны абвінавачваецца ў парушэнні адразу некалькіх артыкулаў Крымінальнага кодэкса: злоўжыванні службовым становішчам, службовым падлогу, крадзяжы ў асабліва буйных памерах. Праз дзесяць месяцаў пасля арышту, у сувязі з пагаршэннем стану здароўя, Тамара Віннікава была вызвалена пад падпіску аб нявыездзе. Але фактычна былога старшыню Нацыянальнага банка ўтрымлівалі пад хатнім арыштам: у яе кватэры, па словах самой Віннікавай, пастаянна дзяжурылі супрацоўнікі Галоўнага ўпраўлення дзяржаўнай аховы.

Існуе некалькі версій наконт знікнення Т. Віннікавай. Адна з іх — былой галоўнай банкіршы ўжо няма ў жывых.

(БелаПАН).

ПАМЯЦЬ

Лучшие уходят рано



Ушёл из жизни Карпенко. Не стало патриота, интеллигента, крупного учёного, политика, просто порядочного человека. Не выдержало сердце лжи, доносов, давления, предательства. 8 апреля страна, друзья, близкие, единомышленники провожали в последний путь Геннадия Дмитриевича.

Я также присутствовал на этой траурной церемонии. Перед Академией наук стояло несколько тысяч человек, развивались бело-красно-белые полотнища с траурными лентами. Люди шли и шли, чтобы отдать дань уважения тому, кого любили и уважали. В конференцзале — море цветов, поток людей всё движется и движется. Разные люди — бизнесмены, учителя, рабочие, пенсионеры. На лицах боль, слёзы. И недоумение: почему? За что такое горе?

Выносят гроб с телом. Колонна в несколько тысяч человек идёт за гробом. Но даже мёртвого Карпенко боятся власти, запретив процессии пройти 400 метров по проспекту, хотя такая договорённость накануне была.

Кладбище, траурный митинг. Выступают Шарецкий, Добровольский и другие. Осмысливая прошедшее, начинаешь понимать, как мало сделал каждый из нас для нашей Беларуси. Как много сделал и еще мог сделать Г. Д. Карпенко. Нужно объединить наши усилия, чтобы сделать нашу Беларусь процветающей, независимой державой, где человек будет свободным, богатым. Объединиться вокруг демократических партий, движений, Свободных профсоюзов. Переступить через свой страх.

Кто хочет больше узнать об ОГП, членом которой был Геннадий Дмитриевич Карпенко, пишите по адресу: г. Ивацевичи, ул. Я. Коласа, 8. Звоните 20-21 апреля по телефону 2-15-54 с 20.00 до 21.00.

С. КУЧИНСКИЙ, член Объединённой гражданской партии. г. Ивацевичи.

Ленинскими бы устами да медок хлебать

"Он родился весной", — пелось в одной песне советского периода о В. Ленине. Родился и принес беду миллионам людей.

Не сиделось же политэмигранту Ульянову в Европе. Подавай ему матушку-Россию на растерзание. За что, спрашивается? Приведем фрагмент "тяжелой" судьбы Ленина в России.

Томясь в Шушенском, молоденький Ильич за свое ссыльное пособие в 8 царских рублей имел чистую комнату, кормежку и чинку белья. "Правда, обед и ужин был простоват, — сетует в своих "Воспоминаниях" Н. К. Крупская, — одну неделю для Владимира Ильича убивали барана, которым кормили его изо дня в день (вот бедняга! — **прим. авт.**), пока не съест; покупали на неделю мяса, работница (нанятая за те же 8 царских рэ. — **прим. авт.**) во дворе в корыте, где корм скоту заготовляли, рубила мясо на котлеты для Владимира Ильича на целую неделю".

Заметьте, все время подчеркивается: "для Владимира Ильича", а Наденька и ее маман, верно, святым духом питались. Барана на неделю молодому революционеру явно не хватало. "Но молока и шанег было вдоволь", — оптимистически завершает свой экскурс в прошлое госпожа Крупская. Добавим к этому, что Вольдемар, как звала его иногда теща, был заядлым грибником, охотником, ягодником, и этот промысел изрядно, надо думать, разнообразил его стол.

Так гнилой царский либерализм выкормил своими руками погубителя России. А вот посадили бы Ильича на трудодни, да хлеб с водой, поди, за версту обходил бы Русь.

О. УСАЧЕВ.

КОЛЬКІ МЫ ПЛАЦІМ

Ох вы, цэны мае, скакуны...

Беларускі спажывецкі рынак па-ранейшаму ліхаманіць. Улічваючы, што кіраўнік нашай дзяржавы катэгарычна супраць пад'ема цэн і падначаленыя яго ва ўсім з ім згодны (а цэны растуць як ні ў чым не бывала), то застаецца думаць, што кошты на прадукты, тавары, паслугі ў нас падымае нячысцік. Так падаражэлі паслугі тэлефона, устаноўлены новыя тарыфы на міжгародныя і прыгарадныя аўтобусы, падраслі кошты рытуальных паслуг.

Падобны тэмп захоўваецца ў нашых магазінах. Нячысцік павысіў цэны на малочныя вырабы, цукар, пячэнне, сметанковае масла, курыныя кумпячкі, селядцы, цыгарэты.

Вось, дарэчы, цэны на прадукты харчавання на 1 студзеня і на 12 красавіка гэтага года:

	1 студзеня г. г.	*12 красавіка г. г.*
каўбаса вараная	*140-150 тысяч*	*295-383 тысячы*
каўбаса (паўвэндж.)	*300-330 тысяч*	*550-620 тысяч*
хлеб	*14000 руб.*	*23000 руб.*
батон	*15000 руб.*	*24000 руб.*
селядцы	*210-230 тысяч*	*400-462 тысячы*
маянэз	*50-60 тысяч*	*85-125 тысяч*
масла сметанковае	*175 тысяч*	*288-355 тысяч*
малако	*8-12 тысяч*	*18 тысяч*

Калі казаць пра цэны на рынку, то трэба заўважыць, што тут яны больш-менш прадсказальныя, бо прывязаныя да валютнага курса. Трохі "супакоіліся" цэны на пральны парашок, бананы, туалетную паперу, алей і г. д.

Застаецца спадзявацца, што на наступнай селектарнай нарадзе кіраўніцтва краіны разбярэцца з тым,чаму цэны скачуць нібы данскія скакуны, калі супраць гэтага выступаюць літаральна ўсе.

А. ГОРБАЧ.

ЗДАРЭННІ

Дадому не даехалі

Жыхароў Слоніма, мужчыну і жанчыну, смерць напаткала каля вёскі Новы Свет Баранавіцкага раёна, на аўтамагістралі Брэст—Мінск. Аўтамабіль "Фіят-Пола", у якім вярталіся дадому сланімчане з Польшчы, спыніўся ля абочыны. Па гэтай жа паласе імчала фура з Масквы і на вялікай хуткасці ўрэзалася ў іншамарку. Ад удару "Фіят" загарэўся, двое сланімчан не змаглі выскачыць з салона і згарэлі. Вадзіцель фуры тлумачыць следчым, што іншамарка стаяла без габарытных агнёў, ён яе заўважыў тады, калі ўжо немагчыма было наезд папярэдзіць.

Л. САШЫН.

РЫНКАВАЯ ПЛОШЧА

ШТО ПАЧЫМ?

Цэны на рынках нашага рэгёна па стану на 14.04.99 г. (у тысячах руб. за адзін кілаграм):

	Івацэвічы	Баранавічы	Бяроза	Пружаны
Свініна	340—400	460—500	350—450	360—400
Сала салёнае	360	300—340	450	320—360
Алей (1 л)	345—380	375—440	330—380	350—410
Яйкі	140	140	130	110—130
Малако (3 л)	60	80	60	60—70
Тварог	70	80	60—70	55—75
Масла сметанк.	320	320	300	310—340
Цыбуля рэпч.	120	120—140	135	140—160
Капуста	90	80—90	80	40—60
Бульба	30	35	30—35	25—35
Морква	70	70—80	60	35—45
Часнок	400	500	400	320—350
Яблыкі	100—170	180—200	150—170	110—170
Лімоны	430	400	420	390—410
Апельсіны	320	320	380	330—350
Бананы	360	360	380	330—360
Грэчка	140	140	140	135—160
Макар. вырабы	110	90—110	110—120	130—140
Рыс	180	180	180	160—170
Цукар	140	155	150	155—170
Мёд	850	850	850	770—830

ВАЛЮТА НА "ЧОРНЫМ" РЫНКУ

(у тысячах рублёў)

	купля	продаж	купля	продаж	купля	продаж	купля	продаж
1 долар ЗША	360	380	360	380	360	380	360	380
1 дойчмарка	180	200	180	190	185	195	180	200
1 рубель Расіі	13	14	12,5	13,5	13	14	13	14



ВІНШУЕМ

На нядаўняй сесіі Косаўскага гарсавета яго старшынёй зноў абрана Тамара Пятроўна Хінко. Гэта — заканамерная падзея, бо Тамара Пятроўна шмат зрабіла і робіць для горада, чула ставіцца да людзей. Мы, члены першічнай арганізацыі таварыства інвалідаў, адабраем гэты выбар дэпутатаў. Віншуем Тамару Пятроўну і жадаем ёй далейшых поспехаў.

У. ЛАСЬКОЎ, старшыня Косаўскай пярвічнай арганізацыі Беларускага таварыства інвалідаў.

ЛЁС ЧАЛАВЕЧЫ

Жыць і радавацца...

Так ужо заведзена кімсьці, што толькі ад сівых пенсіянераў і пенсіянерак мы чакаем споведзей, гісторый, здольных хоць чым здзівіць наш розум, нашы ўяўленні. Калі ж пачуў аб складаным лёсе зусім яшчэ маладой жанчыны Таццяны Зданевіч, кіраўніка гуртка ткацтва Бярозаўскага дзіцяча-юнацкага спартыўна-эстэтычнага цэнтра, то перш за іншае падумалася — ну, якія такія праблемы могуць быць у гэтай маладой прывабнай жанчыны?.. Але аб усім па парадку.

...У адзін даўняшні зімовы ранак дзевяцігадовая Танечка, спяшаючыся ў школу з бацькам, проста паслізнулася і ўпала. Ці мог падумаць у спешцы бацька, што падзенне дзіцяці было больш чым ракавым. Ды й ці мала падае ў жыцці дзіця? У першыя імгненні ён яшчэ паспешліва дапамагаў устаць раптам абмякламу дзіцяці. А ў дзяўчынкі быў... пералом пазваночніка.

Увогуле, Таццяна больш сёння любіць гаварыць аб непераможным жаданні жыць, аб светлым сваім аптымізме. У самыя цяжкія хвіліны яна ніколі не кідалася ў паніку, а чакала заўжды лепшага. Таццяна лічыць, што прафесіяналізм урачоў, яе ўнутраны аптымізм ды малады растучы арганізм дазволілі ў прамым і пераносным сэнсе стаць ёй на ногі.

У 17 год яна ўжо паступіла ў Бабруйскае мастацкае вучылішча. Сказалася цяга дзяўчыны да вытанчанага. Але дзявочы арганізм яшчэ не адчуваў сябе належным чынам. Таццяна добра памятае той дзень, калі, адчуўшы недамаганне, звярнулася да ўрача. "Хачу заўважыць, — кажа яна зараз, — што большасць урачоў даволі падазрона ставяцца да хвароб маладых людзей, асабліва студэнтаў і іншых навучэнцаў. Яно з аднаго боку як быццам і зразумела: студэнты часцяком любяць "пафілоніць". А калі не?"

У той дзень замест таго, каб абследаваць дзяўчыну, урач параіў ёй... сур'ёзней аднесціся да вучобы. На вуліцы Тані стала зусім кепска. Яна толькі ледзь-ледзь памятае як упала на тратуар, як шарахаліся ад яе людзі, як абліў граззю праехаўшы міма аўтобус, як немалады таксіст падняў яе, пасадзіў на задняе сядзенне і дапытваўся аб тым, хто мог яе згвалтаваць. Таня не магла адказаць, што ў некаторай ступені — родная медыцына.

Яна прыйшла ў прытомнасць ужо ў рэанімацыі. Дыягназ — інфекцыйна-алергічны полірадыкуланеўрыт (цяжкая форма са стратай мовы).

Сёння, калі глядзіш на прывабную паходку Таццяны, чароўныя рысы яе твару, слухаючы яе меладычны голас, цяжка паверыць, што ў чалавека за спіною цяжэйшыя хваробы, нялёгкі лёс. І зайздросціш тым дзецям, якія наведваюць у спартыўна-эстэтычным цэнтры яе гурток ткацтва. Бо да сваёй працы Таццяна адносіцца са ўсёй шчырасцю і адданасцю. За тое і любяць дзеці свайго маладога кіраўніка.

...Мінулай восенню, у час паездкі Таццяны па экспанаты ў свой кабінет, здарылася аварыя, у якой зноў пацярпела Таццяна. Дыягназ і вельмі нават складаны — ратацыйны падвівіх пазваночніка, страсенне мазгоў, удар спіннога мозга. Яна ляжылася і ў гарадскім РТМА, была 3 тыдні на абследаванні ў Бараўлянах пад Мінскам. Зараз Таццяна, так бы мовіць, зноў у страі.


— Для сапраўднага шчасця, проста чалавечага спакою трэба не шмат, — кажа Таццяна. — Атрымліваецца, што трэба не мецъ тых непрыгожых якасцей, якіх так многа ў нас. Не быць зайздросным, нядобрым да людзей, злым. Скажу пра сябе, што ў сваім жыцці я радуюся нават шклянцы халоднай вады ў спякоту.

А. ГОРБАЧ.

г. Бяроза.

КОНКУРС "НАШ ДОМ — БЕЛАРУСЬ"

Балада пра Уладзіміра Карвата



Прысвячаецца першаму Герою Беларусі, лётчыку-падпалкоўніку Уладзіміру Карвату, які цаной свайго жыцця адвёў палаючы самалёт ад размешчаных паблізу населеных пунктаў.

Сонца векі апусціла,
шэпчучы малебен.
Тона грознага траціла
задыміла ў небе.

Загарэлася машына,
бы на небе крыж.
У агні ляціць мужчына...
— Ой, Валодзька! Ты гарыш!
Боль цярпіш, але дакуль ты...
Нажымай на катапульту
І адтуль кідайся прэч!
Пакідай машыну-печ!

Тона ўсё-такі траціла
на душы Карвата...
А ў руках пакуль што сіла,
бо... ўнізе — хаты.

Ды гарыць, гарыць машына,
плавіць правады.
У агні ляціць мужчына,
гэткі малады!
— Выскачы!—крычала неба...
— Не, пакуль яшчэ не трэба.
Вытрымае самалёт...
Вытрымае і пілот.

Смерч за вёскай баразну
працягнуў па полю...
І пасеяў дабрыню
з несцярпімым болем.

Развалілася машына...
Страшна! Што — куды...
А ў кабіне той — мужчына,
гэткі малады!
— Можа я ў чым вінавата,
што няма яго, Карвата? —
Чуўся хмаркі слёзны плач. —
Божачка, мяне прабач.

Хмарка, не сумуй у горы.
Хай смяюцца дзеці.
Мо захоча з іх каторы
ў неба ўзляцеці.

На шашы — аўтамашыны.
Ці то справы, ці ваяж.
І з павагаю мужчыны
разглядаюць фюзеляж,
што ў зямлю часткова ўрыты.
Гэта помнік там адкрыты...
Помнік лепшаму з мужчын.
Ён — зямлі і неба сын.

Алесь КОРНЕЎ.

г. Баранавічы.

ВАША ПІСЬМО

ЧАМУ МЫ ТАКІЯ?

На гэты раз за пяро прымусіў мяне ўзяцца невыцерпны сардэчны боль ад цяжкіх думак, навеяных нашым жыццём.

Чаму такое цяжкае наша жыццё, чаму мы такія бездапаможныя, да злачыннасці раўнадушныя, чаму мы сталі пасрэднымі спецыялістамі, дрэннымі бацькамі і выміраючым насельніцтвам?

Часта нашыя людзі ўпадаюць у настальгію па мінулым, іх цягне туды, а гэта выкарыстоўваюць чырвоныя авантурысты для таго, каб вярнуць нас у стойла, таму што без працы рабоў на іх, яны не ўяўляюць свайго існавання. Яны да другога існавання не прывыклі і не прыстасаваны. Гэта ваўкі ў авечай скуры, якія стварылі рабаўладальніцкую сістэму і ўсялякімі спосабамі захоўваюць яе. Рабаўладальнікі і іх васалы ўсе гады так прыніжалі нас, што мы да гэтага прывыклі, у нас няма пачуцця прыніжэння ад чэргаў, ад нарміраванай колькасці прадуктаў, гарачай вады, цяпла...



Мы і зараз, пачынаючы разумець несправядлівасць, усё роўна падтрымліваем іх, маўкліва даём распраўляцца з тымі, хто хоча, каб мы ўсе выбіліся з цемры. Што і гаварыць, мы і дзяцей сваіх абараніць не здольны. Далей дачнага лапіка зямлі нічога не хочам бачыць.

А кругом усё пусцее і ў нашых душах таксама. Забівае паціху Чарнобыль, нязгатная палітыка прэзідэнта, якая ўвагнала нас у жахлівае жабрацтва. І ўзяцца б нам зараз за выбары 16 траўня (мая), якія даюць магчымасць добрых перамен, перспектываў, але нашая маральная спустошанасць робіць сваю справу, дапамагаючы нашым гаспадарам. Хто баіцца, хто не верыць новым кандыдатам у прэзідэнты. Як тут не ўспомніць геніяльнага рускага пісьменніка Л. Талстога: "Для лакея не можа быць вялікага чалавека, таму што ў лакея сваё паняцце аб вялікасці".

Мы не хочам перамен, бо не верым, што яны будуць добрыя, мы не хочам чытаць недзяржаўныя незалежныя газеты, бо нас задавальняе хлусня дзяржаўных. Мы нічога не робім для добрай будучыні сваіх дзяцей, мы пазбавілі іх ідэалаў: аддалі на здзек свой гістарычны герб і сцяг — сімвалы Радзімы, пазбавілі роднай мовы. Зараз раўнадушна назіраем за арыштам кандыдата ў прэзідэнты М. Чыгіра, на спробы знішчэння суверэнітэту нашай хворай дзяржавы, раўнадушна ходзім на працу, бо за яе мала плацяць. З ранняй вясны да позняй восені не разгінаючыся без асалоды працуем на дачных участках ("каб з голаду не памерці"). Мы стомленыя, зняважаныя, абыякавыя да ўсяго... Мы павярнуліся да Бога, сталі хадзіць у храмы, але не пакаяліся, бо нашыя душы не супрацьстаяць злу вакол нас. Чаму ж мы такія? Калі ўваскрэснем? Даруй нам, Божа.

А. ПРЫГОДЗІЧ.

г. Бяроза.

Месячнік пажарнай бяспекі

На жаль, лічбы ў зводках Івацэвіцкага атрада ваенізаванай пажарнай службы насцярожваюць. У першым квартале гэтага года ў раёне здарылася 29 пажараў, загінула два чалавекі. Матэрыяльныя страты, нанесеныя агнём, велізарныя.

Такая сітуацыя пабудзіла Івацэвіцкі райвыканкам прыняць распараджэнне аб правядзенні з 5 красавіка да 5 мая месячніка пажарнай бяспекі. Зацверджан план мерапрыемстваў на гэты перыяд.

Прапанавана кіраўнікам Саветаў, ведамстваў, арганізацый і прадпрыемстваў усіх форм уласнасці распрацаваць канкрэтныя меры па прадухіленні пажараў, недапушчэнні гібелі людзей на іх, прыняць удзел у месячніку.

Вынікі зробленага будуць абмеркаваны на пасяджэннях усіх выканкамаў сельскіх, гарадскога і пасялковага Саветаў пасля заканчэння месячніка.

В. СЯРГЕЙЧЫК.

КРИМИНАЛ

У кого целая оружейная палата, у кого один-единственный наган

В предпоследний день марта городской отдел внутренних дел занимался своей обычной работой — шли оперативно-розыскные мероприятия. И вдруг, а может, и не вдруг в квартире экспедитора одного из ресторанов напоролись на гладкоствольное охотничье ружье, мелкокалиберный пистолет, изготовленный кустарным способом, 32 патрона, 2 барабана к револьверу, банку с порохом, патронташ, 2 ножа. По ст. 231 ч. 1 возбуждено уголовное дело.

Буквально через день в другом районе города нашли наган с 7 боевыми патронами. Барановичский люд вооружается. С кем только воевать люди собираются?

Падабаецца крытычнасць газеты

Мае бацькі выпісваюць "Газету для вас". Я прыязджаю да іх на выхадныя, чытаю і скажу, што поўнасцю згодна з крытычным стаўленнем вашай газеты да падзей на Беларусі.

Растлумачу чаму. Калі год назад я, студэнтка 1-га курса Пінскага медвучылішча, атрымлівала стыпендыю ў 640 тысяч рублёў, то гэта было непараўнальна больш, чым паўтары мільёна сенняшніх. Напрыклад, добра памятаю, як летам мінулага года, атрымаўшы 640 тысяч стыпендыі, пайшла і купіла за 240 тысяч добры ліфчык беларускай фірмы "Мілавіца".

Мяне яшчэ тады ўразіла, што за гэты выраб трэба аддаць трэць стыпендыі. А сёння? Сёння адзін ліфчык каштуе... усю стыпендыю — 1500000 рублёў. Як жа маглі так рэзка знізіцца нашы даходы?

Мая маці — настаўніца. Яе брат, мой дзядзька, які дзесьці "халтурыць" у Польшчы, бывае, прыязджае і ўсё насмяхаецца над яе заробкам. Памятаю, як мінулай вясной ён ёй гаварыў: "Ну что? Ты всё корячишься за свои 60 долларов в школе?"

Цікава, што ён скажа, калі ўбачыць, што сённяшні заробак маёй маці толькі 20-25 даляраў? Калі б яе заробак быў прыведзены ў адпаведнасць з валютным курсам, то яна зараз атрымлівала б 18-20 мільёнаў, а не 7-8.

Мамін брат вырваўся з зачараванага кола, у якім людзей прымушаюць працаваць амаль задарма. Мама ж гэтага зрабіць не можа. Не могуць і многія-многія людзі, якіх я ведаю і не ведаю. Яны пакорліва пераносяць гэты здзек над сабой.

Вось гэтак. Мне падабаецца крытычнасць вашай газеты. Прабачце, што можа не зусім сціплае маё параўнанне даходаў на прыкладзе з ліфчыкам.

Таццяна АНТОНЧЫК.

Бярозаўскі раён.

АД РЭДАКЦЫІ. Не разумеем, Таццяна, за што вы прыносіце прабачэнні. Мы ж не ў каменным веку жывем, калі акрамя дубін і скуры мамантa чалавеку нічога іншага не трэба было.

Преступное искусство

Есть в нескольких километрах от Барановичей поселок Русино. Отныне, пожалуй, он станет знаменитым уже хотя бы тем, что живет там одна очень предприимчивая, прямо до лихости, мошенница. Еще два года назад она под предлогом возможности приобретения валюты по выгодному курсу завладела у доверчивых людей очень даже не малой суммой денег. На сегодняшний день следствие называет 13 тысяч долларов. В сети лихой обманщицы попались все — от пенсионеров до работников банков. Люди давали ей немалые суммы, которые так и не удалось вернуть. Два года назад в возбуждении уголовного дела было отказано, а на сегодняшний день собрано столько неопровержимых улик, что их хватило бы на несколько уголовных дел, тем более, обманутые все еще обращаются в правоохранительные органы и неизвестно, какая сумма выплывет в итоге.

Г. СТРОЦКАЯ.

г. Барановичи.

ШЛЯХ ДА БОГА

О Литургии, проскомидии и не только

Клирик Свято-Александро-Невского Собора иерей **Игорь Мрыхин** (г. Пружаны) отвечает на вопросы, которые часто задают как верующие, так и неверующие люди.


— *Отец Игорь, как возникла необходимость чина Литургии?*

— "Литургия" — слово греческое, обозначает общее, общественное дело, служение, моление. Общественное потому, что на Литургию приходим мы — верующие люди для общей, общественной молитвы. Все мы предстоим в Храме перед Богом как одна семья. У всех нас — один Бог, одна вера, одна надежда на помощь Божию. Все мы, пришедшие на Литургию, в своей совокупности составляем одно тело, Главой которого является Христос; а порознь каждый из нас — отдельный член этого тела. Святейшая Литургия начала непрерывно совершаться после того, как Сам Иисус Христос установил ее на Тайной Вечере в Сионской горнице пред своими страданиями и смертью. Это была очень краткая Литургия. О ней так говорится в Евангелии от Матфея: "Иисус взял хлебы и, благословив, преломил и, раздавая ученикам, сказал: "Примите, ядите, сие есть Тело Мое. И, взяв чашу и благодарив, подал им и сказал: пейте из нее все, ибо сие есть Кровь Моя Нового Завета, за многих изливаемая во оставление грехов" (гл. 26, 26—28). Вот и все сведения о первой, установительной Литургии. Эти сведения касаются самого главного в ней: Тела и Крови Спасителя, которые преподаются верным под видом хлеба и вина. Хлеб и вино освящаются, пресуществляются, прелагаются в Тело и Кровь Христа. Так назвал их, так сказал о них Сам Христос. И, назвав так, причастил ими своих учеников. В этом заключается, к этому сводится основное содержание Литургии как благодатного, божественного таинства, питающего нас "живым", "небесным хлебом" (Иоанн, гл. 6, 33—61, 51), соединяющего с самим Иисусом Христом, с благодатными дарами Святого Духа и приобщающего к жизни нетленной, вечной.

— *Что такое проскомидия?*

— В начале Божественной Литургии совершается проскомидия. Само слово "проскомидия" обозначает приношение, ибо для совершения ее приносятся в алтарь особые вещества, а именно: пять просфор и виноградное вино. После входных молитв и облачения в священные одежды, священник приступает к совершению на алтарном жертвеннике проскомидии. Закончив предварительные молитвы, он берет самую лучшую, большую просфору и вынимает (вырезывает) из нее Агнца. Вынутая часть просфоры называется Агнцем, потому что она изображает Господа Иисуса Христа, прообразом которого в Ветхом Завете служил пасхальный агнец. Заготовление Агнца заканчивается словами: "Жрется Агнец Божий, вземляй грех мира, за мирский живот и спасение". Произнося эти слова, священник крестообразно надрезает на дискосе Агнец, чуть сбоку касается его копием (в память прободения ребра Спасителя) и вливает в чашу вино с водой. Из второй просфоры вынимается частица "в честь и память" Богородицы и кладется она на дискосе справа от Агнца. Из третьей просфоры вынимается девять частиц в честь угодников Божиих; кладутся эти частицы слева от Агнца. Из четвертой просфоры вынимаются частицы за живых, а из пятой — за усопших, при этом читаются записки верующих и церковные синодики. Соединение всех частиц вокруг Агнца на дискосе обозначает всю Церковь Божию, Глава которой — Господь Иисус Христос.

● *СВЯТАЯ ИСТИНА*



Гюстав Доре — Тайная вечеря

— *Отец Игорь, что символизирует торжественное принесение и вхождение в алтарь для совершения Бескровной Жертвы?*

— Вход со Св. Дарами называется Великим и по величию воспоминаемого здесь события, и по важности цели, для которой совершается. Дары переносятся на престол для совершения Святого Таинства Причащения и принесения их в Жертву Богу и изображают Самого Господа Иисуса Христа, шествующего на вольные страдания и смерть за грехи людей. Если Малый вход изображал выход Господа нашего Иисуса Христа на проповедь и мы призывались "придти, поклониться и припасть к Нему", то Великий вход изображает выход Его — Царя царствующих и Господа господствующих — на добровольные страдания и искупительную смерть, с последующим Воскресением и Вознесением. Но вот Великий вход завершен: Святые Дары поставлены на престол. Завеса алтарная задернута. Престол скрылся от взора молящихся. Иисус Христос (т. е. дискос и чаша) уже не виден народу. Он уже на Голгофе. Тут уже и смерть Его на Кресте и снятие со Креста и положение во гроб и одеяние в погребальную плащаницу. Все это запечатлено в словах и действиях, совершаемых священником у престола сразу же после Великого входа. Другой же, чисто литургический смысл заключается в том, чтобы принеся приготовленные Дары на престол, в дальнейших священнодействиях именно на нем освятить их, пресуществить в Святые Тайны Тела и Крови Христовых для причащения верных.

— *"Двери, двери, премудрости вонмем". Так начинается пение Символа веры. Отец Игорь, что означает сей возглас?*

— Перед пением Символа веры священник возглашает: "Двери, двери, премудростию вонмем!" В древние времена первые два слова "двери, двери" относились к привратникам входных дверей храма, призывая их следить, чтобы кто-нибудь из оглашенных или кающихся, или из еретиков и язычников не вошел в храм и не помешал священнослужению. В настоящее время эти слова относятся к нам самим, побуждая нас хранить чистоту наших сердец от вторгающихся в них греховных помыслов. Об этом так говорит св. Киприян: "Единому Богу да будут открыты двери нашего сердца и да не допустят врагу рода человеческого войти внутрь во время молитвы".

Словами "премудрость вонмем" указывается на сокрытую в Символе веры Божественную Премудрость и на то, чтобы молящиеся внимательно с благоговением пели или слушали Символ веры.

Г. ЛЕВЧУК ("БК").



● *ДЗЯРЖАВА І РЭЛІГІЯ*

У межах законнасці

Упершыню ў Баранавіцкім гарвыканкаме праведзена сустрэча членаў камісіі садзейнічання кантролю за выкананнем закона "Аб свабодзе веравызнання і рэлігійных арганізацый" з прадстаўнікамі 16 рэлігійных суполак, зарэгістраваных у горадзе.


Як зазначыў кіраўнік камісіі, намеснік старшыні гарвыканкама Леанід Цупрык, камісія мае права кантраляваць дзейнасць рэлігійных арганізацый, парадак правядзення масавых рэлігійных абрадаў. Усялякія адхіленні ад заканадаўства, сказаў выступоўца, неабходна не толькі своечасова выяўляць, але і аператыўна выкараняць, улічваючы тое, што вернікі з'яўляюцца грамадзянамі нашай краіны. Камісія будзе і надалей спыняць парушэнні, звязаныя, напрыклад, з дзейнасцю дэструктыўных сектаў, якія прапагандуюць антыдзяржаўную палітыку, наносяць шкоду фізічнаму і псіхічнаму здароўю вернікаў.

Падчас сустрэчы кіраўнікі рэлігійных суполак пазнаёміліся са складам камісіі гарвыканкама, яе паўнамоцтвамі і задачамі, планам работы на гэты год.

Л. САШЫН.

● *НАРОДНЫ КАЛЯНДАР*

РАДАЎНІЦА



З Вялікаднем злучаецца старадаўняе свята Радаўніца. Яно прыйшло да ўсходніх славян з часоў язычніцтва.

Радаўніца — гэта дзень памінання памерлых продкаў. Ён адзначаецца на наступным пасля Вялікадня тыдні ў аўторак і таксама, як і Вялікдзень, не мае пастаяннай даты. У гэтым годзе Радаўніца выпадае на 20 красавіка. Свята невыпадкова прымеркавана да вясенніх дзён. Згодна з народным павер'ем лічылася, што душы памерлых прачынаюцца пасля зімовага сну і выходзяць з магіл на сустрэчу са сваімі родзічамі.

На Беларусі Радаўніцы папярэднічаў падрыхтоўчы перыяд. Сваякі памерлых загадзя прыводзілі ў парадак магілы продкаў. На Радаўніцу кожная сям'я ішла памінаць родзічаў спачатку ў царкву, а потым на могілкі. Там расцілалі абрус, на які клалі чырвоныя велікодныя яйкі, пернікі, розныя прысмакі. Надмагільныя крыжы заўсёды абвязвалі белымі вышыванымі ручнікамі, на іх вешаліся невялічкія вяночкі, зробленыя з кветак.

Пачынаючы рытуальную трапезу, клікалі да сябе памерлых: "Святыя радзіцелі! Хадзіце да нас хлеба-солі паспытаць, старыя і маладыя!" Пры гэтым наўмысна пралівалі на магілу віно ці гарэлку. Пасля пачыналі есці самі. За радаўнічым абедам успаміналі добрыя справы нябожчыкаў, расказвалі пра іх жыццё. Пасля яды зноў звярталіся да памерлых: "Мае радзіцелі! Выбачайце, не дзівіце, чым багаты, тым і рады". Рэшту памінальных страў заўсёды пакідалі каля крыжа — "на пасцінец нябожчыкам".

Завяршалася свята вячоркамі ў кругу сям'і ці ў гасцях у аднаго з членаў свайго роду.

● *ТАКОЕ ВОСЬ ЖЫЦЦЁ*

Бязбожнікі арудуюць на могілках

У першы дзень Вялікадня раніцай жыхарка г. Івацэвічы Ц. пайшла на старыя райцэнтраўскія могілкі, каб пакласці на магілы сына, брата і іншых сваіх блізкіх свянцоныя яйкі і лустачкі пірага. Зайшла і аслупянела. Помнік з шэрага граніту, пастаўлены на магіле далёкага сваяка, ляжаў перакулены на агароджу. Хто ж адважыўся на такі гнюсны ўчынак? Міліцыя пакуль адказу не дала, адшукаць зламыснікаў — справа не аднаго дня. Людзі схільныя лічыць, што помнік хацелі ўкрасці, аднак не здужалі яго падняць і панесці. Цяпер гэта рэч дарагая, нічога, што ёсць надпіс і фотаздымак — іх можна знішчыць.

На новых гарадскіх могілках, што ў Панках, бязбожнікі паквапіліся на агароджу, зробленую з нержавеючай сталі.

Бамжы і бамжыхі цяпер зачасцілі на могілкі. Не таму, што цяжар асабістага гора прыгнечвае. У гэтыя Велікодныя дні людзі наведваюць магілы памерлых і пакідаюць ля помнікаў чаркі з гарэлкай, яйкі, пірагі, кавалачкі кілбасы. Вось гэта і прыцягвае заняпалых грамадзян. Ёсць чым ім пажывіцца, ёсць што пакласці ў торбы, якіх па тры-чатыры штукі носяць у руках.

Якія ж вывады можна зрабіць з прыведзеных прыкладаў? Эканамічны крызіс, у моцных абдымках якога апынуліся ўсе слаі насельніцтва, — спрыяльнае асяроддзе для ўсялякага кшталту злачынстваў. Але ж гэта не апраўданне для рабавання магіл. Чалавек цвярозага розуму ніколі не падыме руку на нашы святыні. Пакуль злачынцы не апынуцца за кратамі, ніякага няма суцяшэння і спакою. Учора насмяяліся над чужой магілай, заўтра могуць тое ж самае зрабіць над магілай вашага родзіча.

А. ЛАЎРАНЮК.

● ДА 200-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ А. С. ПУШКІНА



(Працяг. Пачатак у №№ 14, 15).

3. "Душы высокія імкненні.."

Хто не ведае гэтыя цудоўныя пушкінскія радкі! Яны сапраўды напоўнены душэўнай цеплынёй, радасцю. Паэт перажывае, хвалюецца, узнёсла выказвае свае думкі і перажыванні. Усё, што вакол, — і прырода, і людзі — яго захапляе. У першую чаргу ад таго, што ён у родных мясцінах, амаль побач з домам. Міхайлаўскае, хаця і працяг ягонай ссылкі, супакойвае растрывожаную душу. Можна сабрацца з думкамі, можна марыць і пісаць. Праўда, у часы прыходу паэтычнай Музы, а таксама пасля незабыўных сустрэч са сваімі сябрамі.

Міхайлаўскае, Пецярбург, Масква... Пушкін у пастаянным руху, у творчай працы. Ён працягвае пісаць "Яўгена Анегіна" і "Палтаву", з-пад яго пяра выходзіць шмат вершаў, збірае матэрыял для новых твораў — паэтычных і празаічных.

Чытаючы творы вялікага паэта, знаёмячыся з гісторыяй іх напісання, нене дый даведваешся штосьці пра сваю Беларусь, пра яе людзей, пра тыя падзеі, што адбываліся на роднай зямлі.

У паэме Пушкіна "Палтава" ёсць такія радкі:

Казак на север
держит путь,
Казак не хочет
отдохнуть
Ни в чистом поле,
ни в дубраве,
Ни при опасной
переправе...
Зачем он шапкой
дорожит!
Затем, что в ней
донос зашит,
Донос на гетмана
злодея
Царю Петру
от Кочубея...

Амаль ва ўсіх дзеючых асобаў гэтай паэмы ёсць гістарычныя прататыпы. Лічылася, што ў казака, які быў пасланы з даносам, няма наогул прататыпа. Ужо зараз дакладна ўстаноўлена, што казак мае, як кажуць, свой сапраўдны твар. Прозвішча яго — Пётр Яцэнка. Гэта адбылося пад Віцебскам, у Бешанковічах. Менавіта адсюль казак павёз пісьмо-адказ Качубею.

А ідэю стварэння рамана "Дуброўскі" падаў Пушкіну яго сябра Павел Нашчокін. Ён меў уладанне ў Віцебскай губерні, дзе жыла яго сястра. У час адной са сваіх паездак Нашчокін пачуў расказ пра двараніна Астроўскага (так спярша і называўся раман). Гэты дваранін меў судовы працэс з суседам за зямлю, быў выселены з маёнтка і, застаўшыся з аднымі сялянамі, пачаў грабіць на дарогах багатых людзей. Пра гэты выпадак Павел Нашчокін расказаў Пушкіну. Такім чынам беларускі дваранін Астроўскі стаў прататыпам галоўнага героя рамана "Дуброўскі".

"Пры гэтым паведамляю, што першы том рамана "Астроўскі" закончаны і хутка табе ўручу", — так у пісьме свайму сябру Паўлу Нашчокіну пісаў Пушкін. Праўда, пазней ён змяніў назву свайго твора. Так паявіўся раман "Дуброўскі".

У плане работы над "Гісторыяй Пятра І", які захаваўся, адзначаны Мінск, Орша, Віцебск. Старонкі падрыхтаванага тэксту стракацяць назвамі гарадоў і вёсак Беларусі, блізкімі нам імёнамі. Вось адзін эпізод: "Сімеон Полацкі і Дзмітрый... займаліся пры двары Аляксея Міхайлавіча астралагічнымі назіраннямі. Першы з іх прадказаў... да нараджэння Пятра слаўныя яго ўчынкі".

Шмат месца ў "Гісторыі Пятра І" Пушкін надаваў Паўночнай вайне. Расказваецца таксама аб падзеях, якія адбываліся на Беларусі.

"Уся наша пяхота прыйшла да Бешанковічаў, князь Меншыкаў з конніцай стаяў у Забалоцкім павеце...", "У Полацку Пётр знайшоў Шэрамецьева" і г. д.

Цікавасць Пушкіна да гісторыі невыпадковая. Мінуўшчына знайшла яскравае адлюстраванне ў яго творчасці — вершах, паэмах, п'есах, аповесцях, раманах, нарысах. "Павага да мінулага, — падкрэсліваў Аляксандр Сяргеевіч, — вось рыса, якая адрознівае адукаванасць ад дзікасці".

Паэзія, літаратурная творчасць наогул, была для Пушкіна сэнсам жыцця. Ён не ўяўляў сябе па-за гэтай справай. Нават сямейнае жыццё не адлучыла, а наадварот узмацніла ягоную цягу да паэзіі, і з-пад пяра вялікага майстра выходзяць усё новыя і новыя творы, якія заварожваюць сваёй шчырасцю і лірызмам.

Исполнились мои
желанья. Творец
Тебя мне ниспослал,
тебя, моя Мадонна,
Чистейшей прелести
чистейший образец.

Як вы здагадаліся, гэтыя радкі Пушкін прысвяціў сваёй жонцы-прыгажуні Наталлі Ганчаровай, у пісьме да якой яшчэ 30 ліпеня 1830 года пісаў: "Часамі прастойваю перад бялявай мадоннай, падобнай на вас як дзве кроплі вады...". Размова ішла пра карціну Рафаэля "Брыджуатэрская мадонна", старадаўняя копія якой была выстаўлена ў кнігарні Сленіна ў Пецярбургу. Такую аналогію і шчырае прызнанне, якое затым вылілася ў санет "Мадонна", прысвяціў сваёй каханай.

"Каханне яго да жонкі было бязмежным, — пісала В. А. Нашчокіна, жонка сябра Пушкіна. — Наталля Мікалаеўна была для яго богам, якому ён пакланяўся, якому верыў усім сэрцам".

Радкі з пісьмаў Пушкіна: "Не хваліся і не скарджуся, — бо жонка мая краса не па адной знешнасці". "Цябе, мой анёл, кахаю так, што выказаць не магу...", "Ці глядзелася ты ў люстэрка, ці ўпэўнілася, што з тваім тварам нічога параўнаць нельга на свеце — а душу тваю люблю я яшчэ больш за твой твар".

Наталля Мікалаеўна Ганчарова, стаўшы жонкай Пушкіна, дастойна выконвала гэтую нялёгкую ролю. Яе выбраннік быў геніяльным не толькі як паэт, але і як чалавек. Яго душа была напоўнена вялікай жыццёвай энергіяй. Яму падабалася быць паэтам і свецкім чалавекам, вучоным і аматарам шумных народных гулянняў, прыкладным сем'янінам і картачным іграком, гутарыць з царом і свецкімі дамамі... Словам, яго на ўсё хапала і не хапала.

Пушкіну падабалася, як Наталля Мікалаеўна ўмела гаспадарнічаць, як вызначаецца на балях, аднаго за другім раджае дзяцей. Дарэчы, у Пушкіна было чацвёра дзяцей. Ён называў іх па-свойму і па старшынству: Сашка, Машка, Грышка і Наташка.

У Пушкіна была жонка, сям'я, была любоў да жонкі і дзяцей, былі радасці, засмучэнні і трывогі сямейнага жыцця, як і ў кожнага чалавека. Але сапраўднай вяршыняй жыцця паэта, ягоным апотам заставалася творчасць. Ён пішa вершы і прозу, лірычныя, эпічныя і драматычныя творы.

Во цвете лет
свободы верный воин,
Перед собой
кто смерти не видал,
Тот полного веселья
не вкушал
И милых жен
лобзаний не достоин.

Барацьба, Свабода і Любоў складаюць для паэта адзінае цэлае. Пушкін любіў бой. Ён умеў змагацца, умеў несці свой творчы цяжар нягледзячы ні на што. Ён быў Пушкіным. І гэтым усё сказана.

С. КАЖАДУБ.
